Толстовского и Супрасльского списков летописи. Однако следует согласиться с выводами А.Г. Боброва о том, что этот летописный памятник требует нового комментированного издания и более пристального внимания будущих исследователей, которым «стоит обратить особое внимание на некоторую неоднородность этого текста: начиная с 1458 г. он становится более литературно отделанным; в нем появляется значительно больше точных дат. В этой связи следует задуматься о возможном участии в его создании Пахомия Серба, вернувшегося в Новгород в 1458 г. и служившего своим пером архиепископу Ионе» [1, с. 233].


1. Бобров, А. Г. Новгородские летописи XV века / А. Г. Бобров – СПб. : Дмитрий Буланин, 2001. – 287 с.
2. Иконников, В. С. Опыт русской историографии / В. С. Иконников. – Киев : Тип. Императорского Университета св. Владимира, 1908. – Т. 2. – Кн. 1. – 1056 с.
3. Клосс, Б. М. Русские летописи XI–XV вв. : материалы для описания. / Б. М. Клосс, Я. С. Лурье // Методические рекомендации по описанию славяно-русских рукописей для Сводного каталога рукописей, хранящихся в СССР. – М., 1976. – Вып. 2. – Ч. 1. – С. 78–139.
4. Лихачев, Д. С. Русские летописи и их культурно-историческое значение / Д. С. Лихачев. – М. ; Л. : Наука, 1947. – 500 с.
5. Полное собрание русских летописей. – СПб. : Типография Ф. Елеонского, 1889. – Т. 16 : Летописный сборник, именуемый Летописью Авраамки. – 320 стб., 69 с.
6. Полное собрание русских летописей. – М. : Языки русской культуры, 2000. – Т. 16 : Летописный сборник, именуемый Летописью Авраамки. – XII, 240 с.
7. Пресняков, А. Е. Записка о Новгородской 4-й летописи / А. Е. Пресняков // Летопись занятий Археографической комиссии. – 1902. – Вып. 14. – С. 16–21.
8. Псковские летописи / подгот. к печ. А. Н. Насонов. – М. ; Л. : Изд-во АН СССР, 1941. – Вып. 1. – 146 с.
9. Супрасльская рукопись, содержащая Новгородскую и Киевскую сокращенные летописи. – М. : Синодальной типографии, 1836. – 172 с.
10. Тихомиров, И. А. Летописный сборник, именуемый Летопись Авраамки / И. А. Тихомиров // Журнал министерства народного просвещения. – 1890. – Ч. 270. – № 7. – С. 168–171.
11. Тихомиров, М. Н. Летописные памятники б. Синодального (Патриаршего) собрания / М. Н. Тихомиров // Исторические записки. – 1942. – № 13. – С. 256–283.
12. Шахматов, А. А. Летописи / А. А. Шахматов // Новый энциклопедический словарь. – Пг., 1915. – Т. 25. – Стб. 146–166.
13. Шахматов, А. А. Обозрение русских летописных сводов XIV–XVI вв. / А. А. Шахматов. – М. ; Л. : Изд-во АН СССР, 1938. – 372 с.
14. Шахматов, А. А. Общерусские летописные своды XIV–XVI вв / А. А. Шахматов // Журнал министерства народного просвещения. – Ч. 331. – 1900. – С. 90–176.


**Ермалёнак В.А.**

## МАНЕТЫ І СКАРБЫ МЁРШЧЫНЫ АД СТАРАЖЫТНАСЦІ ДА XV СТАГОДДЗЯ

Гісторыя грашовага абарачэння на Беларусі налічвае тысячагоддзі, цягам якіх нашы продкі зведалі нямала войнаў, пошасцяў і галадамораў. Гэтыя негатыўныя з'явы, аднак, дазваляюць нам сёння азірнуцца назад і ўбачыць мінуўшчыну ў яе матэрыяльным увасабленні. Дастаткова ўзяць у рукі манету – драбнюткі кавалак металу, каб дазнацца так шмат пра тое, чым калісьці яны жылі. «Дзякуючы» перыядам ліхалеццяў, бясцэнныя скарбы небарак-гаспадароў, што не паспелі паведаміць спадкаемцам аб месцы схавання дэпазіту, дажылі да нашых часоў і захаваць нам гістарычную памяць і прыносіць нам незабыўнае пачуццё повязі з мінулым.

Аб грашовым абарачэнні на тэрыторыі сучаснага Мёрскага раёна можна даведацца з розных крыніц: гістарычных дакументаў, летапісаў, гістарычнай літаратуры, археалагічных раскопак. Але адной з самых цікавых крыніц вывучэння нумізматыкі з’яўляецца непасрэдна знаходкі манет і скарбаў на мясцовасці. Сябры археолага-краязнаўчага гуртка «Арганаўты мінулага» пад час шматлікіх паходаў і вандровак неаднойчы знаходзілі манеты і скарбы, якія зараз захоўваюцца ў гістарычным музеі СШ № 3 і іншых музеях. Шмат інфармацыі аб знаходках манет у нашым краі ўтрымліваецца ва успамінах старажыхароў, запісы іх знаходзяцца ў навуковадапаможных фондах гістарычнага музея СШ № 3 г. Мёры. На аснове вывучэння, аналізу разнастайных крыніц напісана наша работа. Вялікі аб’ём матэрыялу вымусіў абмежаваць рамкі даследвання XIV ст.

1. АНТЫЧНЫЯ МАНЕТЫ НА МЁРШЧЫНЕ. Не гледзячы на тое, што Мёрскі раён знаходзіцца на адлегласці некалькі тысяч кіламетраў ад былой тэрыторыі Рымскай імперыі, але і ў нашай мясцовасці былі знойдзены антычныя манеты. Гэта абумоўлена, па-першае, наяўнасцю важнага гандлёвага шляху па рацэ Заходняя Дзвіна, якая з’яўляецца паўночнай мяжой нашага раёна; па-другое, існаваннем старажытных гарадзішчаў і паселішчаў жалезнага веку; па-трэцяе, дзякуючы водным артэрыям, насельніцтва мела пэўныя сувязі с антычнай цывілізацыяй. Аб знаходках антычных манет у Мёрскім раёне ёсць публікацыя



Репозиторий ВГУ

А.А. Мельнікавай, але ў ёй дапушчаны недакладнасці, пералік знойдзеных манет няпоўны [4, с. 67–76]. Адзін з першых скарбаў антычных манет ў нашай мясцовасці быў выяўлены ля г. Дзісна ў 1928 г., але навуковага апісання яго няма [1, с. 50]. У музеі г. Лодзі знаходзіцца рымскі сярэбраны дынарый імператара Даміцыяна 81–96 г. н.э. Ён выпадкова быў знойдзены на левым беразе Заходняй Дзвіны непадалёк ад Друі. Адчаканена манета ў 84 г. н.э. На аверсе партрэт імператара, павернуты ўправа з надпісам «Імператар Цэзар Дамініянус Аўгустус Понціфекс Максімус». На рэверсе язычніцкі ахвярны алтар з гірляндамі і агнём, а таксама надпіс: «Трыбуніка Потэстас Консул 8 Патэр Патрыа». У перакладзе з лацінскай мовы ўвесь надпіс гучыць наступным чынам: «Імператар Цэзар Дамініянус Вялікі, Галоўны язычаскі жрэц, Народны трыбун, восьмы раз абраны консулам» [6, с. 121–122]. За такую манету ў Рымскай імперыі ў той час можна было купіць вядро збожжа.

Асабліва шмат рымскіх манет было знойдзена ў наваколлях вёскі Вята, дзе непадалёку знаходзіцца самае вялікае і знакамітае гарадзішча на Мёршчыне – Пруднікі. У 1931 г. пад час наваднення на размытым беразе Заходняй Дзвіны мясцовыя пастушкі знайшлі некалькі залатых манет. Дзве манеты з гэтага скарбу выкупіў стараста Браслаўскага павета Зеліслаў Янушкевіч. Ад яго яны былі набыты польскімі вучонымі Я. Пшэворскай і С. Ларэнцам і перададзены ў Віленскі археалагічны музей. Дзякуючы гэтаму, манеты былі вывучаны прафесарам-нумізматам Уладзімірам Антаневічам. Адна з манет была чаканена імператарам Карынам 283–285 г.н., сынам Каўруса. На аверсе манеты выява галавы імператара, павернутай ўправа вянцом, на плячах плашч і зброя, па краю надпіс на латыні «IMP CARINUS PV AUG», што азначае: імператар Карын, першаначальнік калегіі 20-ці галоўных жрацоў, прарок, аўгур. На рэверсе маецца ўвасабленне міфалагічнай багіні Перамогі – Вікторыі Аўгусты, дзе злева ў лаўровым вянку, у левай руцэ галінка пальмы і па краю надпіс «VICTORIA AUG G» [7, с. 60–61].

Другая манета – солід імператара Валенты (364–378 г.н.э.), які быў уладаром усходняй часткі Рымскай імперыі. На правым баку манеты – выява імператара ў дыядэме і плашчы, у руках трымае сімвалы ўлады—шар і жазло. Надпіс па краю манеты сведчыць наступнае «D N VALENS AUG», а на зваротным баку соліда сядзяць на троне Валент са сваім братам Валенціянам, навокал галоў німбы, у руках трымаюць жазло і кніжку, па краю манеты надпіс: «vota publi ca imp» , што азначае ўладарства па народнаму жаданню. Хутчэй за ўсё манеты выкарыстоўваліся як упрыгожанні, бо ў іх прасвідраваны дзірачкі. Манета адчаканена ў г. Трывіры, зараз Бельгія [6, с. 123–124].

У 1936 г. на гарадзішчы каля в. Пруднікі выпадкова быў знойдзены срэбраны рымскі дынарый 14-га па ліку імператара Адрыянга. Час праўлення гэтага імператара 117–138 гг. н.э. Манета адчаканена ў Рыме ў гэты перыяд. На аверсе профіль імператара павернуты ўправа. На манеце надпіс, які ў перакладзе з лацінскай мовы гучыць так: «Імператар Цэзар Траян Адрыянус Аугустус». На рэверсе манеты выява міфалагічнай багіні Ромы, якая сядзіць на панцыры, у левай руцэ яна трымае кап'ё, у правай – фігурку багіні Перамогі – Вікторыі. Знаходка захоўваецца ў археалагічным музеі Варшавы. У 1982 г. аўтар артыкула паміж вёскамі Туркова і Рыкуны знайшоў на дарозе рымскую бронзавую манету з невялікай колькасцю серабра. Па вызначэнню прафесара Л. Побаля, гэта дынарый 78-га па ліку рымскага імператара Максіміяна Галерыя. Дыяметр манеты 2,1 см, вага 3,57 г. На аверсе бюст імператара Галерыя. Па краю дынарыя надпіс на лацінскай мове «Імператар ГНН Максіміянус П. Ф.». Час яго праўлення 293–311 гг. н.э. На рэверсе палітычны лозунг «Канкордыя мілітум», што ў перакладзе гучыць як «Ваенная згода». Гэта манета сведчыць аб далейшым аслабленні Рымскай імперыі пры Дыяклецыяне. У гэты час вялікая дзяржава была падзелена на чатыры часткі, адной з іх і кіраваў Максіміян Галерый. Цэнтр гэтай часткі знаходзіўся ў г. Сірміі. Тут працавалі чатыры майстэрні, дзе чаканіліся манеты. У межах уладарства Галерыя знаходзілася рымская правінцыя Балканскага паўвострава Паддунаў'е [6, с. 123–124]. Адтуль яна і трапіла ў нашы мясціны. Непадалёку ад Туркова таксама ёсць паселішчы жалезнага веку, ад Заходняй Дзвіны каля дзесяці кіламетраў. Зараз манета знаходзіцца ў экспазіцыі гістарычнага музея ДУА «Мёрская сярэдняя школа № 3». У 2011 г. непадалёку ад былога маёнтка Шчоўна «Арганаўты мінулага» адкрылі старажытнае паселішча II–VIII ст. н.э. У 2013 г. непадалёк намі была знойдзена манета імператара Камода, які уладарыў у 177–192 г. н. э. Яна дрэннай захаванасці, асабліва рэверс. Магчыма, пазней яе выкарыстоўвалі рыбакі як блясну. Непадалёк працякае рэчка Вята, якая праз 20 кіламетраў упадае ў Заходнюю Дзвіну. На аверсе манеты партрэт



Рэпазіторый ВДУ

імператара Камода, павернуты галавой управа. Назва манеты сестэрцый, вага 17 гр., дыяметр 27 мм. Такім чынам, нават пералічаныя знаходкі манет сведчаць аб распаўсюджванні антычных манет на Мёршчыне. Нажаль, большая частка засталася нам невядомай, бо інфармацыя аб знаходках не патрапіла ў дзяржаўныя музеі.

2. МАНЕТЫ ЧАСОЎ СТАРАЖЫТНАЙ РУСІ. А) *Панаванне арабскага дырхема*. Дырхем – ад грэчаскага слова драхма, сярэбраная манета мусульманскага Усходу. Упершыню яна з'явілася ў 692 г. У сучаснай нумізматыцы называеццца куфіцкім – па найменнню арнаментальнага пісьма, што ўзнікла ў г. Аль-Куфа, у якім выконваліся надпісы на манетах. На тэрыторыі Беларусі дырхемы з'яўляюцца ў IX ст. Але асаблівае распаўсюджванне і абарачэнне адносіцца да часоў станаўлення першага дзяржаўнага ўтварэння – Полацкага княства, у сувязі з сацыяльна-эканамічным развіццём і пашырэннем гандлёвых сувязяў паміж Візантыяй, Арабскім халіфатам, Паўночнай Прыбалтыкай, Скандынавіяй. Мёршчына якраз і ляжала на адрэзку знакамітага шляху «З варагаў ў грэкі». Вось чаму на тэрыторыі раёна знойдзена дастакова вялікая кольасць манет і скарбаў куфічных дырхемаў. Найбольш вядомы скарб арабскіх манет быў знойдзены ля в. Краснае яшчэ ў 1896 г. Агульная вага – каля паўкілаграма. 17 дырхемаў перададзены ў Імператарскі Эрмітаж, 62 паступілі ў Віленскі музей старажытнасцяў, 30 манет перададзена ў Санкт-Пецярбургскі ўніверсітэт, астатнія перададзены ў Санкт-Пецярбургскі манетны двор на пераплаўку. Колькі ўсяго было манет ў скарбе невядома, частка манет разышлася па руках, а некаторыя былі ў выглядзе фрагментаў. Хутчэй за ўсё гэта былі рэзаны і вяверыцы. Па вызначэнню вучоных найстарэйшая манета – Аббасіды, аль-Мутадзід 899 г., самая позняя—Саманіды, Нух ібн Мансур 987 г. Акрамя таго, у скарбе былі манеты Бувахідаў, Зійарыдаў, Кангарыдаў, Хамданідаў, імітацыя саманідскай чаканцы [9, с. 71].

Аб знаходках двух скарбаў арабских манет у Старым Пагосце ў 1895 г. мы знаходзім звесткі ва ўспамінах нашага знакамітага земляка Вацлава Ластоўскага [3, с. 184]. Скарбы дырхемаў знаходзілі і на востраве Дзісны, але яны не былі вывучаны. На тэрыторыі раёна чарговы скарб арабскіх манет быў знойдзены ў 1965 г. Нажаль, месца знаходкі не зафіксавана. Па вызначэнні адной знаходкі з гэтага скарбу мы даведваемся, што яны адносіліся да Саманідаў, а менавіта Наср ібн Ахмада (914–943 гг.) [8].

Яшчэ адзін скарб знойдзены ў 1966 г., таксама цалкам разышоўся па руках. У нумізматычны кабінет былі дасланы замалёўкі толькі 3 манет, якія адносяцца па вызначэнню прафесара В. Рабцэвіча да Абасідаў, а менавіта: Мадзінат ас-Салам 776 г., ар-Рашыд ал-Мухамедзія, 797 г., ал-Мамун 824 г. [9, с. 72]. Найбольш датаваныя і вызначаныя манеты арабскага халіфата, якія былі знойдзены пры археалагічных раскопках гарадзішча і селішча ля в. Пруднікі ў 1980–1990-я гг. археолагам В.І. Шадырам. Вызначэнне манет было праведзена навукоўцам В.Н. Мілюціным. Усе знаходкі адносяцца да чаканкі Аббасідаў і Саманідаў. Самая ранняя – Аббасіда аль Махдзі 775 г., самая позняя з датаваных – манета Ісмаіла ібн Ахмед аш-Шаш 906 г. [5]. Унікальнымі з'яўляюцца знаходкі бронзавых падвесак у выглядзе арабскіх дырхемаў пад час абследавання кар'ера гуртком «Арганаўты мінулага» ля в. Казлоўцы ў 1987 г. Пазней сябры гуртка разам з вучонымі АН БССР Л.У. Дучыц, Г.М. Семянчуком выявілі пахаванні ў ямах, такім чынам, там знаходзіўся грунтовы могільнік X–XIII ст. Падвескі, або бракцеаты вывучаліся вучонымі-нумізматамі В. Мілюціным і В. Рабцэвічам. На першай падвесцы захаваўся пяцірадковы тэкст, выдатна капіруючы чэканку саманідскага эміра Насра ібн Ахмада 301–331 г. хіджры (914–946 гг.), Аллаху (Мухамед-пасланік Аллаха) ал Мухтадзір білах Наср ібн Ахмад. Надпіс па кругу бессэнсоўны, набор літараў і літарападобных знакаў. Дыяметр бракцеата 29 мм. Надпіс выбіты толькі на рэверсе. Паколькі яе насілі як падвеску, то прабіты дзве невялікія адтуліны. У адной з іх захавалася кальцо з меднага дроту. Вага падвескі 1,10 г. Дзве другія манетападобныя падвескі захаваліся толькі ў фрагментах. На адной можна прачытаць «Аллаху, Мухамад». Захавалася частка прыкляпанага вушка. Трэці фрагмент падвескі зусім не чытаецца. Падробкі выкананы хутчэй за ўсё ў канцы X ст. Аналагаў падобных бракцеатаў у свеце не выяўлена [9, с. 70].

Б) СРЭБРАНІК УЛАДЗІМІРА. Манета гэтага перыяду трапіла ў нашу калекцыю ў 2010 г. Па інфармацыі яе ўладальніка срэбраннік Уладзіміра ён знайшоў на месцы старой прыстані на беразе ракі Заходняя Дзвіна ў аграгарадку Друя Браслаўскага раёна. Былы горад Друя вядомы ў гісторыі як замак Полацкага княства з XI ст. Пад час разведак на тэрыторыі Друі мы не аднойчы знаходзілі каменныя прылады працы, кераміку X–XIII ст., фрагмент шыфернага прасліца,



Репозиторий ВГУ

пломбы XII–XIII ст. У Друі знаходзіцца і так званы «Барысаў камень» XII ст. Рэчавы матэрыял падцвярджае старажытнасць гэтых мясцін. Таму, знаходка срэбраніка Уладзіміра з'яўляецца толькі падцвярджэннем вышэй згаданага. Срэбранікі Уладзіміра выраблялiся з куфіцкіх дырхемаў. Пасля першапачатковага вывучэння манеты з Друі можна зрабіць наступныя высновы. Манета чаканена з срэбра метрычнай пробы 750, вагою 3 гр., дыяметрам 26 мм. Гурт манеты рабрысты, у двух месцах пашкоджаны, магчыма, з мэтай вызначэння пробы срэбра. На аверсе манеты выява князя Уладзіміра ў анфас, які сядзіць, на галаве шапка з падвескамі, у правай руцэ крыж з доўгім дрэўкам, левая рука на грудзях. Над левым плячом княжацкі знак – трэзубец. На рэверсе выява Хрыста ў крыжападобным вянцы-німбе, які ў левай руцэ трымае Евангелле, а правай багаслаўляе. Надпіс з левага боку – Ісус, а з правага ад выявы – Хрыстос. Па тыпалогіі срэбранікаў манету, знойдзеную ў Друі можна аднесці да першага тыпу [10]. Але яе некаторыя асаблівасці ў выяве князя Уладзіміра і Хрыста не выключаюць яе пазнейшую чаканку.

ПЕРЫЯД ПРАЖСКАГА ГРОША. У XII–XIII ст. абарачэнне манет на беларускіх землях было нязначным. Знаходкі еўрапейскіх і ўсходніх зямель на тэрыторыі Беларусі нешматлікія. Вось чаму ў нас няма інфармацыі аб знаходках манет гэтага перыяду. Выключэннем з'яўляецца манета з медзі – пул Залатой Арды XIII ст., але звестак аб месцы яе знаходкі ў нас няма. Становішча змяняецца ў XIV ст., калі ў 1300 г. у чэшскім горадзе Кутна Гара пачалася чаканка вялікай срэбранай манеты, якая атрымала назву пражскі грош, па надпісе на рэверсе. Яны сталі асновай грашовай гаспадаркі Вялікага Княства Літоўскага ў XIV–XV стагоддзях. На беларускай зямлі знойдзена некалькі скарбаў і шмат адзінкавых знаходак пражскага гроша. Мёрскі раён не стаў выключэннем. У 1926 г. пры апрацоўцы зямлі ў маёнтку Вянужжа, які належыў пану Федаровічу, скарб пражскіх грошаў знайшоў селянін Каравай Васіль Васілевіч. Скарб манет налічваў не менш за 400 асобнікаў і знаходзіўся ў гліняным збане, які разбіўся ад удара ляза плуга. Селянін сабраў манеты і прынёс да хаты. Па невядомай прычыне, паліцыя з павятовага горада Дзісна забрала скарб. Але пазней на гэтым месцы Васіль Каравай знайшоў яшчэ некалькі манет. Паколькі манеты былі сярэбраныя, то пазней з іх рабілі заручальныя пярсцёнкі і завушніцы [2]. У 1986 г. застаўшыеся дзве з паловай манеты былі перададзены ў нашу калекцыю. Захаванасць перададзеных асобнікаў нездавальняючая: і аверс і рэверс манет вельмі сцёртыя. Вага першай манеты 3,3 гр., вага другой – 3,5 гр. Звычайна вага пражскага гроша 3,7 гр. Палягчэнне вагі вывучаных намі манет выклікана дрэннай захаванасцю. Дыяметр манет 29 мм., метрычная проба 930. Надпіс на аверсе «IOANNES PRIMUS DEI GRATIA REX BOEMIA», што азначае: Ян Люксембургскі кароль Багеміі (як вядома, быў каралём Чэхіі ў 1310–1346 гг.). Улічваючы, што кошт пражскага гроша спачатку быў вельмі высокі, то хутчэй за ўсё манеты былі схаваны багатым баярынам. За 400 манет можна было купіць невялікі маёнтак. Так як скарб быў закапаны на невялікай глыбіні, то яго ўладальнік спадзяваўся грошы ў хуткім часе скарыстаць. Значная пацёртасць манет сведчыць аб доўгім тэрміне іх абарачэння. Хутчэй за ўсё скарб быў закапаны пад час феадальнай вайны ў ВКЛ 1432–1436 гг. Уладальнік грошаў не вярнуўся з гэтай вайны, і таму скарб застаўся не запатрабаваны. Лёс самога скарбу невядомы. Па адных звестках, паліцыя адправіла знаходку ў Вільню, па другіх – яе прадалі яўрэямперакупшчыкам. Намі была праведзена вялікая праца па вывучэнні скарбаў манет, паступіўшых у музеі Рэчы Паспалітай, але інфармацыі аб скарбе з Вянужжа не знойдзена. Аб дастакова шырокім распаўсюджанні грашовага абарачэння пражскага гроша ў нашай мясцовасці сведчыць інфармацыя аб іх знаходках ля вёсак Мілашова, Слабада, Лявонпаль, Павяцце, Язна, Стары Пагост і інш. Пад назвай «грошы шырокія» згадкі пражскага гроша мы знаходзім і ў шматлікіх дакументах не толькі XIV, але і ў XV і нават XVI ст. Аб гэтым сведчыць і «Полацкая рэвізія» 1552 года. Але ўсе знаходкі разышліся па прыватных калекцыях і не былі ўведзены ў навуковы ўжытак.

1. Белорусский государственный музей // Белорусская культура. – 1928. – Сб. 1. – С. 50–51.

2. Ермалёнак, В. А. Гісторыя аднаго скарбу / В. А. Ермалёнак // Краязнаўчая газета. –2004. – № 15(32).

3. Ластоўскі, В. Пагост // Выбраныя творы. / В. Ластоўскі. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. – 184 с.

4. Мельникова, А. А. Находки монет античности в Беларуси. Материалы / А. А. Мельникова // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны : навук. зб. – Вып. 4. – Мінск : БДУ, 2008. – С. 67–76.

5. Милютин, В. Н. Находки монет из поселений Прудники / В. Н. Милютин, В. И. Шадыро // Гісторыка-археалагічны зборнік. – 1994. – № 5.

6. Побаль, Л. Д. Антычныя і нумізматычныя багацці Міншчыны і Віцебшчыны / Л. Д. Побаль // Беларускігістарычны часопіс. – 1996. – № 1. – С. 123–124.



Репозиторий ВГУ

7. Побаль, Л. Д. Рымскі імпарт на Браслаўшчыне / Л. Д.Побаль // Браслаўскія чытанні.–Браслаў,1991. – С. 60–61.
8. Рабцэвіч, В. Н. Манеты Арабскага халіфата на тэрыторыі Беларусі / В. Н. Рабцэвіч, А. А. Стуканаў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1973. – № 3.
9. Рябцевич, В.Дирхемы арабского халифатав денежном хозяйстве Полоцкой земли (9–10 вв.) / В. Рябцевич // Славяне и их соседи : сборник. – Минск : Веды, 1998. – 71 с.
10. Сотникова, М. П. Тысячелетиедревнейших монет России / М. П. Сотникова, И. Г. Спасский // Сводный каталог русских монет X–XI веков. – Л., 1982.

**Мартынюк А.В.**

## «МЕЙСТЕР ИОГАНН РЕЛЛАХ»: ЗАГАДКА СРЕДНЕВЕКОВОГО ИСТОЧНИКА И ЕЕ РЕШЕНИЕ

На протяжении уже более чем столетия немецкую историографию занимает проблема «мейстера Иоганна Реллаха». Речь идет о составителе рукописи, которая находится на хранении в городской библиотеке города Нюрнберга (Nürnberg, Stadtbibliothek, Ms. Solg. 16.2°). Рукописи посвящена обстоятельная монография немецкой исследовательницы Кристины Вульф, в рамках которой была произведена научная публикация текста, что делает его доступным для изучения [Wulf 1991].

По палеографическим и кодикологическим данным рукопись датируется периодом 1470-х гг. В составе рукописи содержатся разнообразные тексты (известие о падении Константинополя в 1453 г., два описания путешествий по странам Северной и Восточной Европы и др.), среди которых и перевод на немецкий язык трех книг Ветхого Завета (Иисуса Навина, Судей Израилевых, Руфь). Таким образом, нюрнбергская рукопись чрезвычайно важна при изучении проблематики т.н. «долютеровой Библии» и имеет большое историческое и культурное значение.

Очевидно, что имя составителя рукописи представляет большой научный интерес. В тексте рукописи ее составителем назван «мейстер Иоганн Реллах» (*maister Johannes Rellach*). Сведения о нем можно почерпнуть только из самого текста. Наименование «мейстер» позволяет предположить, что он закончил курс наук в университете; изображения монаха в доминиканском облачении на некоторых иллюстрациях – что он принадлежал к этому ордену. В самом тексте Констанцское епископство названо родиной автора, на этот же регион указывают и диалектные особенности рукописи (алеманнский диалект юго-западных регионов Германии). Упоминание аугсбургского епископа Петра фон Шаумберга (занимал кафедру в 1424–1469 гг.) позволяет предположить, что автор входил в его окружение. Поскольку первая «библиотечная» пометка на рукописи сделана в женском доминиканском монастыре Св. Екатерины в Аугсбурге в конце XV века, можно предположить, что автор закончил жизнь в этом городе.

Однако попытки найти в источниках XV века человека по имени Иоганн Реллах оказались безуспешны. В литературе было высказано предположение, что *Rellach* является анаграммой настоящего имени редактора рукописи, однако и поиск по предложенным вариантам обратного прочтения *Haller* и *Schaller* (с добавлением конечной буквы от имени Johannes) не принесли результатов [Wulf 1991: 140]. В 1894 г. исследователь проблематики Франц Йостес с надеждой писал: «может быть появится кто-то, кто что-то знает о Реллахе!» [Jostes 1894: 782]; столетием спустя Кристина Вульф была вынуждена констатировать, что эта надежда не оправдалась [Wulf 1991: 140].

Между тем, ситуация не представляется столь безнадежной: имеющиеся в наличии и приведенные выше данные позволяют назвать имя предполагаемого составителя рукописи. Настоящее имя человека, скрывавшегося под псевдонимом «мейстер Иоганн Реллах», будет названо автором данных строк в ходе конференции.

1. Jostes, F. Die „Waldenserbibeln“ und Meister Johannes Rellach / F. Jostes // Historisches Jahrbuch, 15, 1894. – S. 771–795.
2. Wulf, Ch. Eine volkssprachige Laienbibel des 15. Jahrhunderts. Untersuchungen und Teiledition der Handschrift Nürnberg, Stadtbibliothek, Ms. Solg. 16.2°. – München, 1991.

Репозиторий ВГУ